УДК 947.6 + 323.15 (476)

*І.А. ПУШКІН*

# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ СУПОЛЬНАСЦІ Ў ДЗЕЙНАСЦІ ПАРТЫЙНА-ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ (1945 – 1990 гг.)

*У артыкуле прааналізаваны прадстаўніцтва і ўдзел нацыянальных супольнасцей у партыйна-дзяржаўным апараце савецкай Беларусі ў 1945 – 1990 гг. Паказаны магчымасці іх уплыву на асноўныя працэсы развіцця Беларусі праз удзел ва ўладных структурах БССР. Вылучаны тэндэнцыі, якія істотна паўплывалі на прадстаўніцтва і магчымасці ўдзелу нацыянальных супольнасцей у дзейнасці партыйнага, савецкага і гаспадарчага кіраўніцтва рэспублікі. З 1960-х гг. стала памяншацца іх удзельная вага сярод кіруючых кадраў і затым стабілізавалася. Нацыянальныя супольнасці праз сваё прадстаўніцтва ў партыйна-дзяржаўным апараце атрымалі каштоўны вопыт удзелу ў вырашэнні мясцовых гаспадарчых, сацыяльных і грамадскіх спраў.*

Немагчыма вывучаць гісторыю і культуру Беларусі без даследавання гісторыі і культуры народаў, якія з'яўляюцца нацыянальнымі меншасцямі (у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ужываецца назва – нацыянальныя супольнасці) у нашай краіне.

Мэтай артыкула з'яўляецца вылучэнне магчымасцей уплыву на асноўныя працэсы развіцця Беларусі нацыянальных супольнасцей праз іх удзел ва ўладных структурах Беларусі ў перыяд 1945 – 1990 гг.

Даследуемы перыяд характарызуецца лёсавызначальнымі гадамі для нашай краіны: 1945, 1953, 1956, 1964, 1985 гг. Аналіз адбыўшыхся падзей дазваляе адзначыць некаторыя тэндэнцыі, якія істотна паўплывалі на прадстаўніцтва і магчымасці ўдзелу нацыянальных супольнасцей у дзейнасці партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва рэспублікі.

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

Для пасляваенных дзесяцігоддзяў было характэрна, па-першае, змяншэнне колькасці беларусаў. Па-другое, у БССР павялічылася колькасць прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей, перш за ўсё рускіх, палякаў, украінцаў (рускіх – прыкладна ў два разы, і дасягнула амаль 1 млн чал., ці 10,4%) [1, с. 352]. Па-трэцяе, назіраўся вялікі энтузіязм насельніцтва, актывізацыя іх дзейнасці ў грамадскім і гаспадарчым жыцці. Праўда, энтузіязм працоўных падмацоўваўся адміністратыўнымі мерамі.

У пасляваенныя гады ў партыйным і савецкім кіраўніцтве, як на рэспубліканскім так і на мясцовым узроўні, былі прадстаўнікі яўрэйскай нацыянальнасці. Але потым сітуацыя стала мяняцца. З аднаго боку, яўрэі выцясняліся з адказных пасад, з другога, каб зрабіць пэўную кар'еру, яны былі вымушаны мяняць нацыянальнасць, не надаючы належнай увагі гэтаму з-за ідэалагічных установак таго часу.

Можна вылучыць два падыходы пры тлумачэнні гэтай з'явы. Першы тлумачыцца антысемітызмам Сталіна і партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва краіны. Гэты падыход падзяляе частка сённяшніх айчынных і яўрэйскіх гісторыкаў (Ізраіль) [2]. У аснове другога падыходу ляжыць залежнасць адносінаў кіраўніцтва СССР да яўрэяў ад палітыкі новаўтворанай дзяржавы – Ізраіля. Савецкая краіна шмат зрабіла для ўзнікнення гэтай краіны і спадзявалася на падтрымку курсу СССР з боку Ізраіля. Але кіраўніцтва новай дзяржавы зрабіла стаўку на палітыку ЗША. Гэта прывяло да недаверу асобам яўрэйскай нацыянальнасці [3, с. 324-329].

У разглядаемы перыяд назіраліся пэўныя асаблівасці ў фарміраванні партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва ў Заходняй Беларусі, асабліва ў першыя 10–15 год пасля вайны. Як адзначае акадэмік М.П. Касцюк, у гэты час да насельніцтва Заходняй Беларусі быў вялікі палітычны недавер, павышаная падазронасць, характэрная для сталінскай сістэмы ўлады. Гэта знайшло адлюстраванне ў прызначэнні кіруючых работнікаў, якія былі пераважна з усходняй і цэнтральнай Беларусі і іншых месц СССР. У заходніх абласцях рэспублікі сярод кіраўнікоў прадстаўнікі нацыянальных супольнасцей складалі 89,7% [4, с. 104].

Даследчык І.А. Саракавік сцвярджае, што такія адносіны захоўваліся аж да 1991 г., і робіць выснову, што "адбывалася мэтанакіраванае масавае запаўненне іншанацыянальным элементам штатных пасад дзяржаўных, грамадска-палітычных структур, сфер культуры, навукі, асветы, аховы здароўя і г.д." [1, с. 352-353].

Амаль 75 год асновай палітычнай сістэмы нашага грамадства з'яўляліся камуністычная партыя і саветы. Рэальную ўладу мела партыйна-дзяржаўная наменклатура, ад дзейнасці якой залежаў увесь лад жыцця краіны. Займаючы адказныя пасады ў кіраўніцтве КПБ і саветах, магчыма было нейкім чынам уплываць на асобныя бакі жыцця насельніцтва. Прычым дзейнасць прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей у партыйна-дзяржаўным апараце насіла інтэрнацыянальны характар, што вызначалася асноўнымі накірункамі знешняй і ўнутранай палітыкі СССР.

Разгледзім гэтыя магчымасці, аналізуючы нацыянальны склад насельніцтва, а таксама найбольш уплывовых установ і апарату ўпраўлення па БССР.

Доля нацыянальных супольнасцей у складзе ўсяго насельніцтва ў разглядаемы перыяд была практычна стабільнай – 18,9% у 1959 г. і 22,1% у 1989 г., але значна меншай, чым у камуністычнай партыі, – 53,49 і 28,9% адпаведна. Найбольш вялікай і меўшай тэндэнцыю да павелічэння была руская супольнасць – з 8,2 да 13,2% ад агульнай колькасці насельніцтва БССР. Яна ж была найвялікшай і сярод членаў КПБ (гл. табліцу 1). Акрамя яе, сярод асноўных нацыянальных супольнасцей, у разглядаемы перыяд павялічвала-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

ся толькі ўкраінская – з 1,7 да 2,9%, але яе частка ў КПБ не была такой значнай, як руская.

*Табліца 1*

**Нацыянальны склад КПБ у 1941 – 1990 гг.**

| Нацыянальнасць / год | 1945 | 1951 | 1971 | 1981 | 1989 | 1990 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Усяго членаў КПБ | 29515 | 116663 | 434527 | 595311 | 699159 | 697608 |
| Нацыянальныя супольнасці (%) | 53,49 | 44,31 | 29,79 | 29,48 | 28,9 | 28,8 |
| Рускія (% ад агульнай колькасці членаў) | 36,88 | 26,88 | 18,62 | 19,35 | 19,08 | 19,09 |

Складзена і падлічана па: Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах 1918 – 1988. – Минск: Беларусь, 1988. – С. 112-115; Справаздачы. Нацыянальны склад партарганізацыі КПБ у 1989 – 1991 гг. // НА РБ. – Фонд 4 п. – Воп.160. – Спр. 26, 929, 1125, 1054.

Больш за 30 год першымі асобамі БССР былі не прадстаўнікі тытульнай нацыі, а асобы з ліку нацыянальных супольнасцей. У 1956 г., упершыню з сярэдзіны 1920-х гг., ЦК КПБ узначаліў беларус – К.Т. Мазураў. У 1965 г. на Беларусі кампартыю ўзначаліў П.М. Машэраў. З яго прыходам стала памяншацца ўдзельная вага нацыянальных супольнасцей сярод кіруючых кадраў кампартыі. На гэта таксама паўплывалі змяненне нацыянальнага складу гарадскога насельніцтва і павышэнне адукацыйнага ўзроўню беларусаў. У суадносіны з працэнтным складам сярод членаў партыі прыйшла колькасць кіраўнікоў рускай нацыянальнасці.

Доля нацыянальных супольнасцей БССР у складзе партыйных кадраў КПБ у 1946 – 1990 гг. змешчана ў табліцы (гл. табліцу 2).

Сярод нацыянальных супольнасцей на ўсіх узроўнях партыйных пасад найбольш былі прадстаўлены рускія. У сярэднім 20-26% ад агульнай колькасці займаючых пасаду, прычым іх удзельная вага з пачатку 1970-х гг. заставалася адносна стабільнай. Акрамя іх, пачынаючы з канца 1960-х гг., на ўзроўні вышэйшага партыйнага кіраўніцтва рэспублікі ўкраінцамі былі: па адным загадчыку і намесніку аддзелаў ЦК КПБ толькі ў 1970-я гг., па 1-2 асобы сярод загадчыкаў сектараў і інструктараў ЦК КПБ у 1970 – 1980 гг.

Сярод сакратароў абкомаў былі 2 украінцы толькі ў 1971 г. Затым сакратарамі былі толькі беларусы і рускія. Сярод апарату абкомаў, гаркомаў і райкомаў у 1970 – 1980-я гг. былі прадстаўлены: украінцы, пачынаючы з пасады загадчыка аддзела гаркома і райкома і да загадчыка аддзела абкома КПБ; палякі – ад загадчыка аддзела гаркома і райкома і да інструктара абкома КПБ. У 1978 г. адзін паляк быў намеснікам загадчыка аддзела абкома. Яўрэі былі сярод загадчыкаў аддзелаў гаркомаў і райкомаў КПБ і па адным загадчыку аддзела абкома ў 1971 г. і намесніку загадчыка аддзелаў абкома ў 1978 г. Прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей працавалі на ўзроўні сакратароў гаркомаў і райкомаў, а таксама загадчыкаў аддзелаў гаркомаў і райкомаў КПБ [5].

Аналіз нацыянальнага складу наменклатуры кадраў абкомаў КПБ, напрыклад на 01.01.1989 г., паказвае, што прадстаўнікі нацыянальных супольнасцей складалі 33,4%. У наменклатуру кадраў абкомаў КПБ быў уключаны 981 кіраўнік прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту, сувязі, будаўнічых арганізацый. Сярод іх – 241 чалавек рускай нацыянальнасці, 53 украінцы, 14 яўрэяў, 12 палякаў, 2 татары, па адным немцу, бурату, адыгейцу, 3 чалавекі іншых нацыянальнасцей [6, арк. 12, 14].

Нацыянальны склад савецкіх кадраў БССР у 1946 – 1990 гг. прадстаўлены ў табліцы (гл. табліцу 3).

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Асобы рускай нацыянальнасці былі сярод кіруючага савецкага апарату БССР на ўсіх узроўнях. Украінцы былі сярод старшынь і намеснікаў старшынь гарвыканкомаў і райвыканкомаў. На больш высокім узроўні мясцовай улады (намеснікі старшынь аблвыканкомаў) па адным украінцу было толькі ў 1989 – 1990 гг. Асобы польскай нацыянальнасці прадстаўлены сярод старшынь і намеснікаў старшынь гар- і райвыканкомаў. Асобы яўрэйскай нацыянальнасці ў статыстычных справаздачах адзначаны толькі ў 1946 г. [7].

Нацыянальныя супольнасці былі прадстаўлены ў вышэйшых выбарных органах улады. Напрыклад, у 1985 г. у склад Вярхоўнага Савета БССР былі абраны 365 беларусаў, 89 рускіх, 15 украінцаў, 16 дэпутатаў іншых нацыянальнасцей. Прадстаўнікі нацыянальных супольнасцей складалі 24,7% [8, с. 11]. Адлюстраванне міжнацыянальных працэсаў у дзейнасці Вярхоўнага Савета БССР раскрыта ў манаграфіі аўтара дадзенага артыкула [9, с. 61-70].

Сярод кіруючых кадраў БССР на 1.01.1989 г. асобаў нетытульнай нацыі было: загадчыкі аддзелаў прэзідыума Вярхоўнага Савета – 16,7% (з 6 асоб – адзін рускі), загадчыкі аддзелаў Савета Міністраў – 15% (з 20 асоб – 3 рускія), старшыні БРК прафсаюзаў – 9,6% (з 21 асобы – па адным рускаму і ўкраінцу), сакратары абласных камітэтаў камсамолу – 24% (з 25 асоб – 5 рускіх і адзін украінец), сакратары гарадскіх і раённых камітэтаў камсамолу – 16% (з 481 чал. – 56 рускіх, 11 палякаў, 9 украінцаў, адзін грузін), міністры, старшыні дзяржкамітэтаў, кіраўнікі рэспубліканскіх устаноў – 17,2% (з 64 чал. – 10 рускіх і адзін украінец), намеснікі міністраў, старшыні дзяржкамітэтаў, кіраўнікоў рэспубліканскіх устаноў – 30,8% (з 169 чал. – 38 рускіх, 10 украінцаў, па 2 палякі і яўрэі) [6, арк. 13-14].

Нацыянальны склад старшынь гарадскіх і раённых саветаў народных дэпутатаў БССР на 1.07.1990 г. (не выканкомаў) складаў: усяго – 179, з іх рускіх – 18, украінцаў – 4, беларусаў – 152, палякаў – 5 [10, арк. 17-17 адв.].

У складзе кіраўнікоў прадпрыемстваў сельскай гаспадаркі БССР на 1990 г. быў 851 дырэктар саўгасаў і 1613 старшынь калгасаў. У асяродку першых нацсупольнасці складалі 13% (52 рускія, 20 украінцаў, 30 палякаў, 3 яўрэі, па адным татарыну, малдаваніну, грузіну, казаху, башкіру, чэху), другіх – 12,3% (81 рускі, 86 палякаў, 19 украінцаў, 6 яўрэяў, 2 грузіны, па адным татарыну, армяніну, грэку, эстонцу) [6, арк. 14].

*Табліца 2*

**Нацыянальныя супольнасці БССР у складзе партыйных кадраў КПБ у 1946 – 1990 гг. (%)**

| Год / назва пасады | 1946 | 1971 | 1976 | 1981 | 1986 | 1989 | 1990 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ | 56,6 | 25 | 42,8 | 43,8 | 37,5 | 25 | 25,5 |
| Намеснікі загадчыкаў аддзелаў ЦК КПБ | 55 | 31,8 | 21,7 | 16,7 | 10 | 11,1 | 18,5 |
| Загадчыкі сектараў ЦК КПБ | 40 | 10,1 | 16 | 14,8 | 22,6 | 15,8 | 20,5 |
| Інструктары ЦК КПБ | - | 23,4 | 22,1 | 17,3 | 19,8 | 21,4 | 21,4 |
| Сакратары абкомаў КПБ | 46,7 | 23,2 | 23,2 | 20 | 21,7 | 17,2 | 16,67 |
| Загадчыкі аддзелаў абкомаў | - | 29,5 | 25,8 | 26,2 | 23,6 | 27,8 | 26,5 |
| Інструктары абкомаў КПБ | - | 21,5 | 22,3 | 25,9 | 23,7 | 24,3 | 22,7 |
| Сакратары гаркомаў і райкомаў (усіх) | 31,4 | 22,4 | 18,3 | 18,9 | 19,2 | 19,8 | 19,7 |
| Першыя сакратары гаркомаў і райкомаў | 37 | 23,3 | 18 | 14,4 | 16,4 | 15,7 | 13,3 |
| Другія сакратары гаркомаў і райкомаў | 31,4 | 22,7 | 14,6 | 21,9 | 15 | 24,4 | 21,2 |
| Сакратары гаркомаў і райкомаў | 26,5 | 21,3 | 22,4 | 20,5 | 26,1 | 23,3 | 26,5 |
| Інструктары гаркомаў і райкомаў КПБ | - | - | 18,9 | 21,8 | 21,2 | 17,5 | 21,1 |

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Складзена і падлічана па: Справаздачы. Нацыянальны склад партыйных кадраў (КПБ) // НА РБ. – Фонд 4 п. – Воп. 156. – Спр. 968. – Воп. 133. – Спр.70, 71.

*Табліца 3*

**Нацыянальныя супольнасці БССР у складзе савецкіх кадраў у 1946 – 1990 гг. (%)**

| Год / назва пасады | 1946 | 1971 | 1976 | 1981 | 1986 | 1989 | 1990 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Старшыні аблвыканкомаў | 8,3 | 0 | 50 | 16,7 | 16,7 | 16,7 | 16,7 |
| Намеснікі старшынь аблвыканкомаў | 46,2 | 38,9 | 16,7 | 16,7 | 22,2 | 25 | 14,2 |
| Старшыні гарвыканкомаў | - | 27,3 | 21,2 | 17,7 | 16,7 | 25 | 29,7 |
| Старшыні вясковых райвыканкомаў | - | 19,7 | 20,7 | 15,4 | 16,2 | 10,3 | 12 |
| Намеснікі старшынь выканкомаў | - | 30,9 | 24,2 | 19,5 | 19,6 | 18,8 | 17,9 |

Складзена і падлічана па: Справаздачы. Нацыянальны склад савецкіх кадраў БССР // НА РБ. – Фонд 4 п. – Воп. 156. – Спр. 969 (1946 – 1989 гг.), 767, 769 (1990 г.).

Безумоўна, гэта ў асноўным статыстыка. Яна адлюстроўвае толькі некаторыя працэсы, якія адбываліся ў той час. На яе ўплывалі змяненні ў нацыянальным складзе гарадскога насельніцтва, павышэнне адукацыйнага ўзроўню беларусаў, правядзенне ў справе фарміравання партыйна-дзяржаўнага апарату палітыкі адміністратыўнага рэгулявання долі тытульнай нацыі і інш. Але статыстыка дазваляе зрабіць пэўныя высновы.

Такім чынам, у пасляваенныя дзесяцігоддзі вырашэнне нацыянальнага пытання на тэрыторыі БССР было падпарадкавана інтарэсам умацавання камуністычнай улады, яе ўнутраным і знешнепалітычным мэтам, што не магло садзейнічаць захаванню іх нацыянальных традыцый.

У разглядаемы перыяд назіраўся палітычны недавер, павышаная падазронасць да асоб, якія патэнцыяльна маглі займаць кіруючыя пасады, з ліку беларусаў і выхадцаў з Цэнтральнай і Заходняй Беларусі.

У пасляваенныя дзесяцігоддзі доля нацыянальных супольнасцей ва ўладных структурах была большай, чым іх доля ў складзе ўсяго насельніцтва рэспублікі. У 1965 г. у Беларусі кампартыю ўзначаліў П. Машэраў. З яго прыходам стала памяншацца ўдзельная вага нацыянальных супольнасцей сярод кіруючых кадраў партыйнага, савецкага і гаспадарчага апарату і пазней заставалася стабільнай.

Неабходна падкрэсліць, што прадстаўніцтва нацыянальных супольнасцей у партыйным і савецкім кіраўніцтве БССР забяспечвалася не толькі ў залежнасці ад поглядаў і кампетэнтнасці асобы, але і адміністратыўным шляхам.

Нацыянальныя супольнасці праз свой удзел у дзейнасці партыйна-дзяржаўнага апарату адыгралі значную ролю ў жыцці рэспублікі і атрымалі каштоўны вопыт у вырашэнні мясцовых гаспадарчых, сацыяльных і грамадскіх спраў.

Нягледзячы на трансфармацыю адносінаў улады да яўрэяў і некаторых іншых супольнасцей, з улікам змен у колькасным складзе насельніцтва Беларусі, можна сцвярджаць, што эліта нацыянальных супольнасцей у 1945 – 1990 гг. адчувала сябе камфортна ў партыйна-дзяржаўным і гаспадарчым кіраўніцтве рэспублікі.

*ЛІТАРАТУРА*

1. ***Саракавік, І.А.*** Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. – Мінск: Современная школа, 2006. – 456 с.
2. ***Рот, Сесиль.*** История евреев. С древнейших времен по шестидневную войну / Сесиль Рот / пер. с англ. – Иерусалим, Б.Г. – 428 с.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

3. ***Кожинов, В.В.*** Наследники победы / В.В. Кожинов. – М.: Изд-во "Алгоритм", 2007. – 480 с.
4. ***Касцюк, М.*** Сталіншчына і Беларусь / М. Касцюк // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 2. – С. 98-106.
5. Нацыянальны склад партыйных кадраў // НА РБ. – Фонд 4 п. – Воп. 156. – Спр. 968.
6. Гадавая справаздача // НА РБ. – Фонд 4 п. – Воп. 156. – Спр. 966.
7. Справаздачы. Нацыянальны склад савецкіх кадраў БССР // НА РБ. – Фонд 4 п. – Воп. 156. – Спр. 767, 769, 969.
8. БССР. Вярхоўны Савет. Скліканне, 11-е. Сесія, 1-я. Стэнаграфічная справаздача. – Мінск: Беларусь, 1985. – 312 с.
9. ***Пушкін, І.А.*** Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990 – 2005 гг.): манаграфія / І.А. Пушкін. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2007. – 206 с.
10. Справаздачы. Нацыянальны склад саветаў // НА РБ. – Фонд 4 п. – Воп. 156. – Спр. 767.


Паступіў у рэдакцыю 26.06.2008 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова